ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 41 (4996) 19 кастрычніка 2018 г.

ISSN 0024-4686

*Асцярожны аптымізм Георгія Марчука* стар. 4

*Паэзія жаночага роду* стар. 8

*Сучасны тэатр: у дыялогу культур* стар. 13

16+

# Вядзе кніга

**Краіна мацуецца кнігай. Гэтымі днямі галоўная кніжніца Беларусі прымае гасцей з многіх дзяржаў. У Нацыянальнай бібліятэцы пад патранатам Міністэрства культуры праходзіць V Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры». У гэтым прадстаўнічым форуме бяруць удзел спецыялісты галіны з Беларусі, Азербайджана, Польшчы, Расіі, ЗША і Украіны. Невыпадкова тэмай кангрэса стала камфортнае асяроддзе бібліятэк, а таксама новыя тэхналагічныя і тэхнічныя сродкі, што маюць на мэце дапамогу ў карыстанні кніжнымі фондамі.**

**Адмыслова для кангрэса ў Нацыянальнай бібліятэцы падрыхтавана выстаўка «Бібліятэкі будучыні: тэхналогіі, будынкі, абсталяванне». Тут прадстаўлены найноўшыя дасягненні ў галіне тэхнічнага абсталявання бібліятэк. Так, беларускай кнізе ўжо больш як паўтысячы гадоў, але разам з тым галіна імкнецца ісці ў нагу з часам.**



Фота Кастуся Дробава.

## Мінск — Бялград: шляхам паразумення

*З 21 па 28 кастрычніка кнігі Беларусі будуць прадстаўлены на Бялградскім міжнародным кніжным кірмашы.*

*Шэраг айчынных выдавецтваў пазнаёміць жыхароў Сербіі з абліччам Беларусі, увасобленым праз яе кніжную культуру: ад вытокаў і першых друкаваных выданняў да сучаснай мастацкай творчасці і самых смелых праектаў па яе прасоўванні да чытача. Маштабныя кніжныя кірмашы даюць магчымасць паглядзець, як гэта сёння робяць іншыя.*

*Бялградскі міжнародны кніжны кірмаш — адна з найстарэйшых і значных літаратурных падзей у гэтым рэгіёне, які збірае вялікую колькасць выдаўцоў з краін Еўропы, Азіі, Амерыкі і Афрыкі.*

Працяг тэмы на стар. 9—11 ►

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 18041